# Правы чалавека ў дзіцячых малюнках

**_Днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў Мінску адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў Рэспубліканскай выставы-конкурсу "Намалюй свае правы. 70 гадоў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека"._**

Арганізатары конкурсу — ААН, Міністэрства адукацыі, Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі — ставілі задачай мерапрыемства паглыбіць веды навучэнцаў аб правах чалавека, садзейнічаць выхаванню ў іх павагі да правоў і свабод, выявіць і падтрымаць юныя таленты. Падчас падрыхтоўкі работ і ўдзелу ва ўрачыстай цырымоніі юныя творцы нямала даведаліся і пра Дэкларацыю правоў чалавека (а гэта, між іншым, дакумент, які перакладзены больш як на 500 моў і з гэтай нагоды ўнесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса), і пра работу ААН, і пра ўласныя мастацкія магчымасці, у рэшце рэшт.

Што ж адлюстравалі ў сваіх малюнках удзельнікі выставы-конкурсу? І вельмі складаныя паняцці як, напрыклад, права на разуменне — работа 16-гадовага Арсенія Кіслякова з сярэдняй школы № 16 Гродна, якая заняла 2-е месца ў сваёй намінацыі, так і звычайныя жыццёвыя з'явы, зразумелыя нават самым маленькім — "Прагулка на любімым веласіпедзе", лепшая работа ў адной з намінацый 6-гадовай Алісы Рудэнка, выхаванкі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

Дзеці расказалі пра важныя бакі жыцця, што тычацца грамадзянскіх, палітычных, эканамічных, сацыяльных і культурных правоў кожнага з нас. Па-свойму, дзесьці зусім па-дзіцячы, дзесьці як амаль дарослыя людзі, але абавязкова шчыра, цікава, нярэдка вельмі нечакана. Так, навучэнка 2 класа дзяржынскай гімназіі № 1, выхаванка Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Дзяржынскага раёна Таісія Сысоева, чыя работа "Паглядзі на свет з іншага боку" заняла 2-е месца ў сваёй намінацыі, расказала, што намалявала сама сябе — ну любіць дзяўчынка стаяць на галаве і бачыць прывычныя рэчы ў новым ракурсе! Кожнаму б даросламу такое ўменне — не стаяць на галаве ў прамым сэнсе, а пашыраць межы ўспрымання, бачыць незвычайнае ў звычайным!

Усяго ў заключным этапе выставы прынялі ўдзел больш за 500 юных беларусаў — дзеці і падлеткі ва ўзросце ад 6 да 17 гадоў. 30 аўтараў лепшых работ Рэспубліканскай выставы-конкурсу "Намалюй свае правы. 70 гадоў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека" ўзнагароджаны дыпломамі I, II і III ступеняў і падарункамі, 400 удзельнікаў удастоены дыпломаў выставы-конкурсу. Сярод пераможцаў і прызёраў — Варвара Швайба, якая займаецца ў НЦМТДіМ, Яна Закрэўская са Жлобінскага гарадскога цэнтра творчасці дзяцей і моладзі "Эўрыка", Аліна Абрамчык з сярэдняй школы № 44 Віцебска, і многія іншыя хлопчыкі і дзяўчынкі.

**Марына ХІДДЖАЗ.**